Аляксандр Гужалоўскі

прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт», доктар гістарычных навук, дацэнт (г. Мінск, Беларусь)

# Канцэптуальныя падыходы да мадэрнізацыі музейнай сферы Рэспублікі Беларусь



У наш час вельмі важнае тэарэтычна-метадалагічнае і практычнае значэнне набывае выяўленне месца і ролі культуры ў цэлым, а таксама музейнай справы, у прыватнасці, у працэсе мадэрнізацыі сучаснага беларускага грамадства. З гэтага вынікае адна з прыярытэтных задач дзяржаўнай культурнай палітыкі, а менавіта — распрацоўка і рэалізацыя эфектыўнай сацыяльнай мадэлі айчынных музеяў. Неабходнасць вырашэння такой буйнамаштабнай і шматкампанентнай задачы вызначаецца інавацыйнай накіраванасцю развіцця сучаснага грамадства.

Сёння на дзяржаўным узроўні распрацоўваецца і хутка пачне рэалізоўвацца канцэпцыя «Беларусь–2030». Гэта не толькі эканамічны, але таксама сацыяльна-філасофскі і культуралагічны праект з доўгатэрміновым гарызонтам рэалізацыі. У названым кантэксце актуальным і перспектыўным робіцца распрацоўка і рэалізацыя даследаванняў эканамічных, сацыяльна-палітычных і культурна-ідэалагічных бакоў жыцця нацыі, якія канцэнтруюцца ў чалавечым капітале, у такіх яго важнейшых складаючых, як навука, адукацыя, ахова здароўя, культура, музеі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Узмацненне ўздзеяння розных культурных інстытуцый, перш за ўсё музеяў, на развіццё чалавечага капіталу, павінна быць сфакусіравана ў першую чаргу на стварэнне чалавечага патэнцыялу, спрыяльнага для мадэрнізацыі не толькі эканомікі, але і іншых сфер жыццядзейнасці грамадства. А гэта патрабуе фарміравання асобы, здольнай не толькі ўспрымаць ва ўсёй паўнаце выклікі мадэрнізацыі, але таксама знайсці адэкватныя адказы на іх. Менавіта на асобу павінны быць накіраваны асноватворныя прынцыпы, ідэі і падыходы культурнай палітыкі ў сферы захавання Музейнага фонду і развіцця музеяў Рэспублікі Беларусь.

За сваю гісторыю беларускія музеі сфарміравалі ўнікальны Музейны фонд і назапасілі бясцэнны вопыт захавання і папулярызацыі нацыянальнай культурнай і прыроднай спадчыны. Захоўваючы традыцыі, што склаліся, беларускія музеі выкарыстоўваюць інавацыі ў музейнай практыцы, іх дзейнасць заслужана атрымала міжнароднае прызнанне.

Музеі з'яўляюцца часткай дзяржаўнай сістэмы захавання культурнага здабытку нацыі і забеспячэння яго перадачы будучым пакаленням. Клопат дзяржавы аб захаванні і выкарыстанні культурнай спадчыны з'яўляецца найважнейшым фактарам забеспячэння пераемнасці, стабільнага і бесканфліктнага развіцця грамадства. Унікальнасць музейных збораў Беларусі ў значнай ступені вызначае яе культурны статус у сусветнай супольнасці. Музеі спрыяюць павышэнню адукацыйнага ўзроўню насельніцтва, даюць магчымасці для развіцця творчай, сацыяльна адказнай асобы і тым самым уносяць значны ўклад у развіццё чалавечага патэнцыялу Беларусі.

Музеі краіны ўсё паўней убудоўваюцца ў праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў і рэспублікі ў цэлым. Захоўваючы спадчыну, прапаноўваючы яркія, нестандартныя рашэнні ў галіне культурных практык, музеі здольныя стаць фактарам, які ўплывае на рост даходнасці тэрыторый, інвестыцыйную прывабнасць рэгіёнаў.

Развіццё музейнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь на працягу апошніх дваццаці пяці гадоў адбывалася ў перыяд змен, што закранулі ўсе яе бакі і былі звязаны са станаўленнем рыначнай эканомікі, актыўным укараненнем інфармацыйных тэхналогій, засваеннем новых методык выкарыстання гуманітарных рэсурсаў і павышэннем патрабаванняў да якасці культурных паслуг. У гэтых умовах прыкметна ўзрастае роля падтрымкі дзяржавай не толькі функцыянавання, але і развіцця музеяў.

Асаблівасць музея ў тым, што ён адначасова з'яўляецца захавальнікам нацыянальнай спадчыны і суб'ектам рынку паслуг. Музеі —



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

некамерцыйныя арганізацыі і могуць ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць толькі ў межах дасягнення мэт, дзеля якіх яны створаны, і тую, што адпавядае гэтым мэтам. Гэта вымагае фінансавай падтрымцы з боку дзяржавы, але не вызваляе музеі ад абавязку ўлічваць рэаліі рыначнай эканомікі, засвойваць гаспадарчае мысленне, укараняць новыя прылады кіравання і арганізацыі дзейнасці.

Аналіз прапаноў спецыялістаў у галіне музейнай дзейнасці, а таксама вынікі прафесійнага і грамадскага абмеркавання пытанняў развіцця музейнай дзейнасці на розных мерапрыемствах дазваляе сфармуляваць наступныя *важнейшыя праблемы музейнай справы Рэспублікі Беларусь*:

неадрэгуляванасць фінансавага забеспячэння музеяў ва ўмовах постсавецкай эканомікі;

нераўнамернасць развіцця музеяў Беларусі, калі разам з вядучымі музеямі, якія працуюць на ўзроўні сусветных стандартаў, ёсць музеі, якія не маюць матывацыі да мадэрнізацыі і ўкаранення інавацый у сваёй дзейнасці;



адставанне ў засваенні і ўкараненні музеямі новых тэхналогій і практык;

недастаткова развітая матэрыяльна-тэхнічная база музеяў, якая перашкаджае эфектыўнаму вырашэнню задач па захаванню і папулярызацыі культурных каштоўнасцей;

недасканаласць музейнай нарматыўна-прававой базы, якая не ахоплівае ўсяго спектра існуючых адносін і практык, звязаных са спецыфікай функцыянавання музеяў;

праблемы кадравага забеспячэння галіны, звязаныя з нізкай аплатай працы музейных спецыялістаў.

Не менш важнае метадалагічнае значэнне за вызначэнне праблемнага поля айчынных музеяў мае выпрацоўка бачання *прыярытэтных задач беларускага грамадства, якія павінны вырашацца з актыўным удзелам музеяў*, а менавіта:

павышэнне якасці чалавечага капіталу, прадстаўленне магчымасцей для развіцця чалавека праз індывідуалізаваную бесперапынную адукацыю;

развіццё міжрэгіянальнага і міжнароднага супрацоўніцтва, падтрыманне станоўчага вобраза Беларусі ў свеце;

паляпшэнне якасці сацыяльнага асяроддзя, забеспячэнне доступу да нацыянальных і сусветных культурных каштоўнасцей;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фарміраванне нацыянальнай, рэгіянальнай і лакальнай ідэнтычнасці чалавека на аснове гістарычнай свядомасці і сацыяльнай адказнасці;

фарміраванне і ўкараненне каштоўнасцей і стандартаў здаровага ладу жыцця, сацыяльнага даверу, талерантнасці, экалагічна адказных паводзін;

развіццё турызму, стварэнне на аснове рэсурсаў культурнай спадчыны дадатковых крыніц для забеспячэння ўстойлівага развіцця рэгіёнаў;

культурная адаптацыя мігрантаў і развіццё міжкультурнага дыялогу.

Пры вызначэнні дадзеных прыярытэтных задач, звязаных з музейнай дзейнасцю, можна сфармуляваць наступныя *важнейшыя тэндэнцыі сучаснага развіцця музеяў*:

узрастанне ролі музеяў у сферы адукацыі за кошт актыўнага выкарыстання ўнікальнага прадметнага асяроддзя музейных экспазіцый;

актыўнае ўкараненне ў працу музеяў інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій;

укараненне інтэрактыўных форм работы і як вынік рост значэння вобразна-эмацыянальнага і дасугавага складнікаў працы з наведвальнікам;

выхад музеяў на новыя перспектыўныя рынкі: інфармацыі, культурнага турызму, рэкрэацыі і інш.;

стварэнне музейных цэнтраў, якія дэманструюць прыклады фарміравання якасна новай прасторы камунікацыі і вытворчасці новых ідэй;

з'яўленне новых тэхналогій, механізмаў і арганізацыйных форм, якія дазваляюць забяспечыць захаванасць музейных прадметаў і калекцый пры адначасовым пашырэнні іх даступнасці для наведвальнікаў;

выпрацоўка новых падыходаў да кіравання, фінансавання і арганізацыі працы музеяў;

развіццё музеяў як камфортнага асяроддзя шляхам прыярытэтнага развіцця інфраструктуры прыёму наведвальнікаў.

З улікам вышэйсказанага трэба вызначыць наступныя *перспектыўныя вектары развіцця айчыннай музейнай сферы*:

ператварэнне музейнай дзейнасці ў значны фактар сацыяльнага і эканамічнага развіцця;

умацаванне адзінай культурнай прасторы Беларусі на аснове захавання духоўна-маральных каштоўнасцей і гістарычных традыцый;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

забеспячэнне максімальнай даступнасці культурных каштоўнасцей для ўсіх слаёў насельніцтва;

забеспячэнне інавацыйнага развіцця музейнай справы, укараненне ў музейную практыку сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;

узрастанне ролі музеяў у сістэме культурна-пазнавальнага турызму і развіццё музейна-турыстычнага патэнцыялу рэгіёнаў;

павышэнне сацыяльнага статусу работнікаў музеяў;

удасканаленне арганізацыйных і прававых асноў дзейнасці музеяў;

эфектыўнае выдаткаванне бюджэтных сродкаў у музейнай дзейнасці;

актыўнае выкарыстанне ўласных даходаў і прыцягненне спонсарскіх і дабрачынных сродкаў.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. *Гужалоўскі, А. А.* Новыя тэхналогіі ў музеі / А. А. Гужалоўскі // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. — 2012. — № 2 (18). — С. 136—145.

2. *Ляшковіч, А. Р.* Стан і развіццё музейнай дзейнасці / А. Р. Ляшковіч, В. І. Макарава, А. Б. Сташкевіч // Беларуская культура–2014 : стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, ДУА «Інстытут культуры Беларусі»; уклад. : А. Р. Гуляева, І. Б. Лапцёнак. — Мінск : Інбелкульт, 2015. — С. 161—176.

3. Музеі Беларусі = Музеи Беларуси / [рэдсавет : Г. П. Пашкоў, Л. В. Календа, М. Г. Нікіцін; маст. В. В. Катовіч, М. У. Чуднікаў]. — Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. — 560 с.

4. Первый национальный форум «Музеи Беларуси» : сб. материалов деловой программы, Гродно, 12—14 октября 2012 г. / сост., под общ. ред. И. Б. Лаптенок. — Минск : Институт культуры Беларуси, 2013. — 313 с.

5. *Федотова, В. Г.* Модернизация и культура / В. Г. Федотова // Знание. Понимание. Умение. — 2012. — № 4. — С. 139—147.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ